**С. А. Казлова**

# МАГІЛЁЎ У 1654 ГОДЗЕ

Падчас вайны Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг. склалася драматычная сітуацыя вакол Магілёва, які ў XVII ст. з'яўляўся адным з буйнейшых і багацейшых гарадскіх цэнтраў Беларусі. Горад на працягу 13 гадоў вайны двойчы мяняў краіну, якую падтрымліваў у час вайны. Галоўная мэта работы – высветліць прычыны пераходу жыхароў Магілёва на бок Расіі ў пачатку вайны Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654 г. на аснове вывучэння гістарычных крыніц.

Вайна 1654–1667 гг. мела феадальны характар. Яна была падрыхтавана і распачата расійскім урадам, які хацеў павялічыць свае зямельныя ўладанні за лік Беларусі і Украіны.

Жыхары Магілёва ў 1654 г. апынуліся паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, непаслушэнства якім аднолькава заканчвалася смерцю або палонам. У Вялікім Княстве Літоўскім вайсковыя абавязкі грамадзян строга рэгламентаваліся Статутам і законамі магдэбургскага права. Жыхары Вялікага Княства Літоўскага, якія ўхіляліся ад вайсковых абавязкаў у час вайны, лічыліся здраднікамі, і за гэта "караліся горлам" (смяротнай карай). У той жа час мяшчане Магілёва разумелі, што горад не падрыхтаваны да абароны.

Беспаспяховая абарона Мсціслаўскага замка ў ліпені 1654 г. і так званая "Трубяцкая разня" ўразілі мяшчан яшчэ больш. Гараджане павінны былі выбіраць: бараніцца, каб горад быў спалены і разрабаваны, а яго насельніцтва знішчана, ці здацца і захаваць свае правы і прывілеі. У грамаце, якую цар Аляксей Міхайлавіч надаў гораду 15 верасня 1654 г., вызначалася наступнае: "А их, бурмистров, и райцов, и лавников, и мещан права их и привилия, городу Могилёву наданые, велели им подтвердити, что те их права нарушены не будут" (Белоруссия в эпоху феодализма, т. 2, 1960). Мяшчане, як людзі практычныя, выбралі апошняе. Пад уплывам угавораў манахаў з Куцеінскага манастыра 25 жніўня 1654 г. горад без асаблівага супраціўлення здаўся расійскім войскам. І спачатку, як паказалі наступныя падзеі, не памыліліся, бо рускі цар надаў гораду грамату, якая не толькі пацвердзіла ранейшыя правы і прывілеі, але і давала новыя: права выбіраць з ліку гараджан войта, якога раней прызначаў кароль Рэчы Паспалітай. Тым самым яшчэ больш пашырыліся правы горада ў галіне самакіравання.

Такім чынам, прычынай здрады жыхароў Магілёва Рэчы Паспалітай стала імкненне захаваць у складаны ваенны час жыццё, горад, сваю маёмасць, а не жаданне "ўз'яднацца з рускім народам", як гэта трактавалася гістарычнай навукай у савецкія часы.